Сяргей Панізнік

# СЛОВА
# НА ДАБРЫДЗЕНЬ

*Лірыка*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1982

Бел 2
П 16

Рэцэнзент Ф. Яфімаў

П 70403 —026  61—82 4702120200
М 302(05) — 82

# МАЦЯРЫК

## Радзіма

Калі да Радзімы іду са сваёю любоўю,—
Радзіма ў дыханні і ў кожнай крывінцы жыве,

у песні вяртаецца з самага жорсткага бою,
над абеліскамі горкай хмурынкай жыве.

Іду да Радзімы, а сэрца трывогу вартуе,—
Радзіма, як хваля, спякоту душы абаўе,

люляе, як Нарач, і, як Белавежа, гадуе
пад кронамі дзён абнадзейныя крокі мае...

Радзіма, Радзіма — неразгаданае дзіва:
заснежжа стагоддзяў на вечназялёнай траве.

## Сустрэча сяброў

Дарога абудзіла нашы вершы.
Іх даручалі вышыні арлінай...
Зліліся спеўна ў гуках Белавежы
Расіі гуслі,
кобзы Украіны.
Як песня — Русь,
я веру, вечнай будзе:
заступніца бяды і лютай злосці...
Прыходзяць вершы,
як прыходзяць госці,
смяюцца, думу думаюць,
як людзі.

## Ля хаты Луцэвічаў

Журкоча жалейка
журботная, жніўная:
— О, Лецейка-Лета,—
як Вязынка, дзіўная! —
На камень зымшэлы,
як продак, прысяду...
Спявае жалейка
Купалы прысягу.

## Над Нёманам

Кроны ў Лета запыталі:
— Дзе аблокі начавалі?
Зналі ліпеньскія далі,
зналі нёманскія хвалі,—
і паведалі яны:
— Прыплылі сюды з вясны
і жывуць па-над ракой
з чаратамі, асакой...
Над лугамі аблачына,
пад жытамі, і над намі,
і над мройнаю дзяўчынай
з васільковымі вачамі...
Будзе ў памяці заўжды:
воблакі
і сінь вады,
бор Якубаў,
вішні сок
і звінюткі каласок;
вокны ветлівай хаціны,
праз якія ў шчодры свет
углядаецца падзіўна
краю роднага Паэт.

## Купалле

Купальская слодыч... Як горача
ад поўні, ад коней... Зноў палящца
не толькі агні нашай горычы,
таксама агні нашай памяці.

Зялёнае — не забываецца,
не затухае — чырвонае...
Што ў продкаў складалася ў памяці,
у нас адгукаецца звонамі.

Як гэта нязвыкла-усцешана,
калі па-над зорнымі кроснамі
трапечацца зыркая сцежачка
ад жаркай жвірынкі — да космаса.

Ніколі не адзінокія,
не часта часінай здаволены,
стаім ля агню, сінявокія:
і мы, і нашчадкі свавольныя.

А песня зямлі — паўтараецца...
Купалка — дзіцятка народнае.
Вунь — новы агонь узгараецца,
вунь саграваецца роднае,

і гарачэе сумежнае:
усё, што ля слова сябрыннага...
Зноў полымя ночы узвершана
на рогі світанку зубрынага.

## Мацярык

*Таварышам па пяру*

Каб чуць і звон мячоў,
і маці крык
(калі была бяда на перавесе),—
ўзыходжу на гарачы мацярык: .

Прыдзвінне...
Магілёўшчына...
Палессе...
Радзіму Каліноўскага пазнаў...
У нас адна крыніца сілы, веры!
І пісар земскі позву пераслаў
усім нам на аднолькавай паперы[1].
Ідуць вякі. Тысячагоддзя след
праз кожны наш радок смялей ірдзее.
...Мо й гэты вечарназаве паэт
маленькім вечам заўтрашняй надзеі.
Мы — слоў радня.
І мова-караннік
праносіцца цераз пякелле верша,
ўрастаем у гарачы мацярык,
някучы ад улоння да заверша.

## Багрым

**I**

Плыла няволя небам нізкім.
Звінелі глуха ланцугі.
Душа пакутніка, як пліска,
жыла на астраўку тугі,
дзе пелі гуслі ўжо без веры,
а славу слоў адолеў мох...
Паэты —
ўсіх вякоў асверы,
што ўзносяць прагу перамог.

**II**

Вясна. Ды скрыпуча полазу.
І чуецца свіргат вякоў.
«Хацелася б з Вашага голасу
мне накаваць жаўрукоў!»
А ласка даўно запрошана
на ўспомненае цяпло.

[1] Маецца на ўвазе радок са Статута 1588 г.: «А писаръ земъски маеть по руску вси листы выписы и позвы писати а неиншимъ езыкомъ и словы»,

Няскрушаным
тут, пад Крошынам,
стаць бы мне на крыло.

## Промні памяці

*Міколу Гусоўскаму*

Свежы дзень з цішынёй, чысцінёй
над маімі лунае радкамі...
Продкі — родзічы мовы маёй —
кнігі лёсу стваралі вякамі.
Адымала пяро пасланнё,—
чарапкамі пісалі, клінкамі,
укрываўленымі гайнёй.
Ім Радзіма давала імя,
Іх праводзіла, сустракала.
І нічога больш, акрамя
светлай памяці
не давала.
Углядаецца ў далеч сэрца,
і святлеюць радкі высноў:
што
з напісанага — застаецца,
што
Радзімай крэўнай завецца,
што
як полымя узаўецца
для наступнікаў, для сыноў.

## Скарына

Як маці ўсіх добрых размоў —
зрудзелая кніга. Скарына,
бывай: я вярнуся дамоў
і за Цябе, і за сына.
Ты ж зелле нясі каралю,
гаючымі травамі ўвіты.
...Ля Полацка, у зямлю

вярбовы калок быў убіты.
Разросся. Да бальшакоў,
як волаты, дрэвы ступілі...
Пытаю праз далеч вякоў:
а мы вось, як Ты, ці любілі?
Выгнаннік. Ды ў сэрцы зямлі
пульсуе радок Твой раскуты.
Без бацькаўшчыны, без сям'і
стаяў перад чарай атруты.
Любіў... Не адразу кароль
вярнуў сыну бацькавы спадкі.
Ад Прагі да Полацка — золь.
Праз восень лячу без аглядкі.
А мы вось, як Ты, ці любі...
...Пад роднымі зорамі, небам
любоў стала пылам ці хлебам,
ці, можа, атрутай — і пі?..
Ад Прагі да Полацка — снег.
Па развітанні ў трывозе
на бераг прыдзвінскі прыбег:
ты ж — тут. Пры вялікай дарозе.

## Мацей Бурачок

Вучыў нас:
і верце, і дбайце...
І словы ішлі па зямлі
бацькоўскія:
«НЕ ПАКІДАЙЦЕ...»
Не кінулі мы... Не маглі.
Пакутна нямелі
у горле
маўчальніцтва халады.
Мацей Бурачок,
...«НЕ УМЁРЛІ!»
А значыць, жывеш і ты!

«ЯК ТОЕ ЗЯРНО Ў ГАРЭХУ»
збудзілася ля людзей

ГАВОРКА мая,
бы рэха
з бацькоўскіх тваіх
грудзей.

Хоць мова мая
не ў страце,
але калі ёй служу,—
«Збароненае —
не пакідайце!»,—
я й дзецям сваім кажу.

## Язэп Драздовіч

Шляхі складаў нядаўна
там, за Пушчай,
паміж марозам белым і агнём...[1]
І як мы Тваю працу спажывём,
як вочы ад утомы не заплюшчым?

У дзень наш як аклікнуты ганец,
прыходзіш са скарынінскай вярэнькай.
Аблашчаны Тваёю акварэлькан
і я, жытнога космасу жылец.

Цяпер іначай мне звіняць бары
і камяні ўздыхаюць ля наплеча...
Збіраюцца на працу,
як на веча,
культуры беларускай ваяры.

## Ліпы Альбы

*Паводле «Ліпаў у Альбе» М. Сеўрука*

Беларусь, твой зоўны лёс — дарога.
Ты сто разоў пытаеш на вяку:

[1]Словы з «Дзённіка» Драздовіча.

«Ці многа нас?
Ці многа нас?
Ці многа
знаходзіцца на кожным бальшаку?»
Ішлі мы ад Скарыны да Купалы.
Праходзім ад Купалы ў новы дзень.
А ты усё ўглядаешся:
«Ці мала?»
Уздыхаеш:
«Хоць бы так, як у людзей...»
І ліпы Альбы ў пакручасты век
ўрастаюцца з карэньчыка крутога...
Ля іх прайшоў адзін твой чалавек,
а — вечнай! — усміхаецца дарога.

## Зоська Верас

*«З дому не рухаюся... Так што калі Вам хочацца мяне адведаць, не адкладайце: чым хутчэй, тым лепш... Але мушу вытлумачыць, як да мяне дабрацца, бо жыву даслоўна ў лесе...»*
*З ліста Людвікі Антонаўны Войцік — Зоські Верас*

А дарога — дзе золь, дзе верас
у пажухлым зімой лісці...
Маладзенькая Зоська Верас,
як нялёгка да Вас дайсці.
І не бор той густы над Вільняй,
не надростачкі-сас396някі,—
замінаюць гадоў узвівы,
нашы звілістыя вякі...
І самім Вам ля дзевяноста.
Столькі жыцінак у вязьму!
Ды з-за лесу, з-за бору постаць:
— Добрых летаў яшчэ вазьму!
...Баравая, уся лясная,
уся памятлівая на здзіў.
Не пытаюся я, бо знаю,

вечны верас хто пасадзіў.
Паспяшаюся — і паверу:
даўгалецце наша — любоў!
...Дзесь над Вільняю Зоська Верас
прыручае нам галубоў.

## Любоў

*Аляксею Пысіну*

Звяртаюся да родных, да сяброў,
да тых людзей, што смерць перажылі,—
і слухаю пра крэўную любоў
да сцяга,
да былінкі,
да зямлі.

Мой сцяг быў ратаваны у баі,
мае былінкі вораг не стаптаў...
І помняць маладыя салаўі,
хто верным сябрам
Беларусі
стаў.

Шчаслівая, зямля жывых вякоў,
і мужнасцю, і вечнай дабрынёй.
Цяпер ідзе ў дазор мая любоў...
І Бацькаўшчына
за яе
бранёй.

## Ян Судрабкалн

Жывыя словы — ветразі быцця:
іх паўтараюць мора, сосны, вецер...
Радкі паэта — звесненае веццe.
Яго паклон у авіяканверце
праз Дубулты нёс лірыкі бацян.

І з самае халоднае душы
прабілася чаканая адліга.
Закаралююць Янісы на Ліга,
паспеюць на ляшчынах спарышы,
развеецца апошні вехцік ліха,—
і выслухаеш, як у свет шырокі
спяшаюць Яна Судрабкална крокі.

## Расінка

*Ніне Мацяш*

Святлівая расінка Беларусі,
калі спяваеш —
я не зажуруся,
ля слоў тваіх
нікому не скаруся,
хоць і вятры, і сцюжы —
наўскасяк.
Зямля і сэрца
прагнуць вернай варты
і памяці,
шчаджонай і упартай...
Дык будзем
хоць малой іскрынкі варты,
жывічны ашчаперыўшы касяк.

## Дзін Рыд

Дзін Рыд беларусам зычыць
«...многа любові,
многа шчасця,
многа смеласці,..».
Амерыканскі былы каўбой
зычыць маладым спеласці,
жыцця барацьбітнага,
зычыць міру,
зычыць Лучанку

заўсёды мецъ звонкую ліру.
Ведай, каўбой:
мы ў жыцці паўсюдным
і не заўсёды былі ў сёдлах,
але ніколі, каўбой, ніколі
ў ласо не душылі
незахамутаных коней.
Спявай, яздок! Спявай, Дзін Рыд!
Спявай, коннік, наўзрыд,
вольны вязень ускапычанага Каларада:
добрыя твае зычэнні,
добрыя твае парады.
Хай жа будзе
ад твайго да майго парога
любові — многа,
    шчасця — многа,
    смеласці — многа.

## Купалаўская струна

Мы пішам. Класікі маўчаць.
А нам не пазычаць запалу —
і пішам, што ў душу запала:
і лёгка нам радок пачаць.

І мы трывожым дзень калючы,
сваёй раллі падзол балючы.
І сочаць продкі з-пад зары:
што ж мы майструем на двары?

А мы штосілы дзьмём у горны,
сучасныя мы ладзім формы,—
каб веку выкаваць пячаць.
Куём. А класікі маўчаць,

Яны сказалі, хто што змог —
за нас, за тых, хто заўтра прыйдзе.
Мы нішам. І яны не ў крыўдзе:

не вырас на паперы мох,
не атушыў цяпло сумлення,
не перарваў скразную ніць,
бо ў кожным нерве пакалення
струна Купалава звініць.

## У старажытным леце

Зноў жыта выспявае.
А вецер навявае,
мая — падкрылкам лета —
атулена шчака.
Мне ласкава і лёзна,
шчымліва, светла, слёзна...
Радзімай абагрэта
жыцця майго рака.
Крыніцы — вусны студзяць,
бары — ўспаміны будзяць...
Сцяжыны тут уюцца
дачушкі і сынка.
У старажытным леце
расце, гамоніць вецце:
мае вякі кладуцца
ў вякі мацерыка.

## Школа

Там жаўранкі вяртальныя смяюцца.
Звініць званок над борам
выпускны...
Настаўнікі —
са школай застаюцца,
удумлівей, ад кожнае вясны.
А мы ў адлёт.
Сустрэча будзе — святам,
журботлівым здзіўленнем не ў пару:
сівее мой настаўнік Марцінята,
праменячы юнацкую іскру.

Пазвоньвае ў камель ракі падкова...
Здаецца, бор мой
затрубіў у рог...
Ідзе урок.
Прасвечваецца школа
паперадзе усіх маіх дарог.

* * *

Салёная раса
на скалах высыхала.
Паўднёвая краса
чакала ля прычала.
За межамі зямлі,
дзе й карані — у цела,—
спяваючы, жылі
пацеха і ўцеха.
Пад сонечным агнём
палянка дагарала...
Вось так і мы жывём,
як росы! — дарагая.
Такі ўжо запавет
марской
граніцы.
Чыёй расінкі след —
глянь: на скале граніцца?

## Народ

**I**

Тыя, хто хваляцца:
помняць начлег, агарод,—
яшчэ не народ;

што пад частушкамі
выстаялі ў карагодзе,—
яшчэ не ў народзе;

што не саромяцца песні,
сялянскага роду,—
яшчэ не з народу;

думы свае паядналі
сяброўскім паходам,—
яшчэ не з народам...

**II**

Молат і серп...
Іх і прашчуры нашы кавалі,—
толькі ж рабамі
іх найчасцей называлі.

І над шаломамі
гербы і сцягі насілі,—
толькі ж працоўных
кулі Курлова касілі.

Вораг не ўстрашыў,
і людзі паўсталі гарою.
Зрынулі свастыку,
ушанавалі герояў.

Зведалі людзі і слодыч
і золкую горыч...
Нельга застацца
ні побач народа, ні поруч.

Нельга застацца завусенкай,
стрэмкай калеччай...
Дыхаю я —
і ў народа ўздымаюцца плечы.

## Сябры

Агонь мой белавусы,
гары, гары ў бары!
Нас клічуць: — Беларусы!

Яшчэ завуць: — Сябры!

Краінай-партызанкай
народжаныя мы.
Лятуць за намі ў заўтра
гаркавыя дымы.

Трымай, арбіта, грузы,
касмічныя дары...
І там ёсць беларусы,
харошыя сябры.

Дзе земляка не ўбачыш!
Прайдзі усю зямлю,—
пачуеш кліч гарачы,
сыноўняе «Люблю!».

Не звыкшыся з прымусам
ад вечнае пары,
шануюць беларусы
імя свае: — Сябры!

## Тост

«Часам з квасам,
парой жа — з вадой...»
Не жыву я ўжо
з прымаўкай той.
Ды ніяк не забыцца святой
светлай песні
пра ночку відную,
ясен месяц,
заранaчку-служку,
партызанскую золкую стужку...
Уздыміце ж вы
кварту-паўнюшку,
ад віна, ад надзей залатую —
за той квас,
за вадзічаньку тую.

* * *

Усміхаліся паэты
з маладзенькіх фотаздымкаў.
Пад высокае натхненне
ліра звонкая гула.

Усміхаліся паэты.
Дым вайны. Сінеча дымкая...
З негустога пакалення
рунь любові — узышла!

**Паходня**

Зацеплім вугалёк:
гары, агонь паходны!
Збяруцца хай здалёк
сябры ўсе да паходні.

Для тых святлей гары,
хто сэрцам астывае,
хто з намі да зары
паходню не ўтрымае.

Нальем жывіцы зноў
у чашу іскравую.
І выправім сыноў
мы пад паходню тую.

Калі ж прыцішым крок
і станем ва уклоне,—
хай скокне вугалёк
у іхнія далоні!

**1942**

Я памятнага часу прадстаўнік.
За паўшых незачасна працаўнік.

...Маўчанне. Жаўранкі маўчаць.
І дрэвы ў задумёнасці пахілай.
Гукніце незабытую магілу —
нас 10 тысяч выйдуць сустракаць...

Нязрушаная войнамі зямля,
ці ты усіх — чацвёртых — спавясціла,
што Сцяг Чырвоны — гэта наша сіла:
над Сцягам мы — з чацвёртымі — сям'я.

...Святое права памятаць жывым
пакуты, страх і выклік нескароны,—
каб атамныя чорныя кароны
над воблакам не ўзніклі дажджавым.

Мой абавязак сёння — жыць і жыць,
трымаць на сэрцы помнікі зямныя...
Таму мой дзень і горыччу заные,
і шчасцем невымерным задрыжыць...

Я памятнага часу прадстаўнік.
За паўшых незачасна працаўнік.

**Пабрацімы**

Мой дзень учарашні шапоча:
— Я — Крэва...
Глядзіць і дзень заўтрашні ў вочы:
— Я — Дрэва!

О, дні — вы мае пабрацімы.
Я з вамі
у шэрагі крэўнай Радзімы
прызваны;

ў кагорце сяброў не баюся
нягоды:
і дні ўсе мае — Беларусі,

і годы,..

Без вас не было б ні мяне,
ні Радзімы.
І людзі і дні, і вякі —
пабрацімы.

## Кліч продкаў

Прарываецца зрух вясны:
гэта клічуць з настылых пячор
жартаўлівыя продкі.
Продкаў кліч. Кліч крыві...
І таму у тваіх вачах
разнасцежылася гуканне:

— Зялён наш бор, зялён,
ой, зялён.
Паш бор зялён
ды над усімі барамі.
Славен мой край, славен,
ой, славен
зверхнасцю над варагамі!

## Трубы Гародні

Трубілі трубачы ў Гародні.
Зноў нылі сцены. Грому быць!
І лепшым ваярам не жыць
і не паліць свае паходні.

Было: трава — і тая нікла,
зары ўжо болей не відно...
Ірвы кіпелі. І на дно
сцякала кроў з ваўчыных іклаў.

На ўсё была свая прычына:
перастаналі трубы граць —

варожая смялела раць
і меншала сыноў Айчыны.

## Камяні

*М. Ткачову,*
*даследчыку замкаў*

А была тут сцяна:
вежы помніць яна...
Рэха бітваў гудзела над пушчамі.
Ты шлях намяні:
адны камяні,
ляжаць камяні невідушчыя.

Разапрэлі муры.
Ад нядаўняй пары
ля падмуркаў свіціліся друзгалкі.
Ты шлях памяні:
маўчаць камяні
і замкі твае беларускія.

Але рэха крані —
і жытло цішыні
абачнецца з вякамі гудучымі.
Ты шлях памяні:
завуць камяні,
крычаць камяні па-над davкручамі.

Зноў паўстане сцяна.
Не стаптала вайна
нашы мары, задумы вялікія.
Ты шлях памяні!
Мо й мы камяні?
І мы камяні — свет-
ла-
лікія.

## Суседства

*Укладальнікам*
*«Слоўніка беларускіх гаворак...»*

Суседзі ў слове...
Без мяжы
Здаўна і песні нашы ходзяць.
А мова кожнаму з нас годзіць —
абы квітнела на душы.
Народ! Ты слова харашы,
трымай яго, як промень, чыстым:
хай будзе вечным і вячыстым!
Суседзі ў слове, без мяжы...
Па карце Карскага Яўхіма
хоць варажы — не варажы,
а слова й заўтра будзе гімнам
гучаць і клікаць: — ДАРАЖЫМІМ!

## Вільнюсу

Помніш, Вільня:
з крыжацкіх лейцаў
Грунвальд клікаў нас да мяча...
Б'ецца Вільні гарачае сэрца,
а плячо — ля майго пляча.
Вырастала з радком Купалы
тут
скарынінскіх кніг сям'я.
О, як слова тваё
уздымала,
абнадзейвала слава твая.
Светлы Вільнюс,
узнесці вежы
нашай еднасці не забудзь.
...Багдановіча гулкія вершы
на сустрэчу з табой завуць.

## Івянец

Дабрынёю край багаты.
Дню дарожнаму вянец,
вось ён — бойкі, зухаваты,
сінявокі і кудлаты
дзіўны горад Івянец.
Тут чаруюць годаў чары,
талент майстравых людзей.
У вішнёвай чарадзе
хата дзядзькі Палінара[1]
не забудзецца нідзе.
Тут народ жыве такі:
будуць новыя вандроўкі,—
а збаны, гаршкі, глякі
з івянецкаю фляндроўкай
праняссе цераз вякі.
А дзяўчына ўскіне вейкі
і пранікла паглядзіць,—
вымкне сэрца салавейкам,
аж пад сонца узляціць.
(Ці не марыў так любіць?)
Зазвініць тады з паклонам
залатых лугоў званец.
І не вернешся з палону...
І не вернешся з палону,
што завецца: *Івянец*!

## Севастопаль

Я Севастопаль сніў:
была ў мяне патрэба.
О Беларусь, і тут
жывуць твае сыны.
Ударам у званы
бяздоннешнага неба,
з Казарскім[1] дарагім

[1] Хата А. Ф. Пупкі, народнага разьбяра.

ударым у званы.

Геройскаю душой ты,
горад, мне знаёмы
Нямала землякоў
тут пала ў час вайны.
Ударым у званы
марскога акаёма.
З кагортай ваяроў
ударым у званы.

Гарачы камень твой.
А крылы маладосці
праўляюць на вятрах
праводзіны вясны.
Ударым у званы,
зямлі вякоўнай госці!
За спараднёны лес
ударым у званы.

## Раёны ветлівых бабуль

Каля сцяны сатлелі кроены.
Запылены штыкетнік, дом.
Унук гадуецца
у вёсцы,
дзе лапушынне пад акном.
Гадоўля гэтая — давесак
і да кілбас, і да турбот,
што слоў набраўся «дзеравенскіх»
хлапец ля бабіных варот.
Нялёгка сёння ад вакзала
дабрацца аж за той барок,
дзе й нас бабуля гадавала,
дзе казкі дзіўныя казала,
пасля дажынкаў запрашала:

---

[1]«Казарскаму. Патомству ў прыклад» — з такім надпісам пастаўлены ў Севастопалі помнік герою руска-турэцкай вайны1828-29 гадоў, ураджэнцу Беларусі Аляксандру Іванавічу Казарскаму.

— Хадзі, снапок, і ў мой дварок!
...Раёны ветлівых бабуль!
Ад абласцей вы, ад сталіцы
далёка-блізка, ды пакуль
скрыпяць масніцамі святліцы,
і паўстае сцяна пшаніцы,—
нам прыйдзецца
да вас
туліцца.
За тым жа словам сырадойным
аўтобусамі — у дрыгцё
ляцяць з імпэтам незатойным
у не-па-мер-лае жыццё,
ад гарадскіх усіх выгодаў,
згіпертанічаных прамоў
імкнуцца — хоць бы на суботу —
імчацца
гарады
дамоў.

## Да музаў

Ці смутку час, ці славы час,—
не пакідайце, музы, нас.
Бо вечны — толькі час турботы.
Вы патрабуйце з нас работы.
Не дзеля хлеба, ўзнагарод:
каб «дзякуй» змог сказаць народ.
На вас, шаноўныя, надзея:
вясло у творчасці — Падзея.
Ганіце нас на строму дня,
бо цішыня — не вышыня.
Мы — у народа ва ўслужэнні.
Судзіце нас за паражэнні,
калі не апраўдаем ЧАС.
Не пакідайце, музы, нас.

* * *

Няма старонак у жыцця,
бы ў папшарце ці кнізе.
Ёсць першы міг,
і ёсць — працяг:
жыві — і праясніся
з лісточка ўверсе,
што, як сцяг,
аж да лісця
унізе.

## Маладзейшым

Не для расы ці божае кароўкі,—
ёсць адрасы, дзеля чаго тварыць:
пішыце вы для Панчанкі, для Броўкі,
для ўсіх, хто ўмеў, хто ўмее гаварыць,

хто навучыў трымаць пяро і голаў,
і з летапісаў, песень узлятаць,
і хто ў вазах Скарыны зрушыў колы,
хто побач з Каліноўскім здолеў стаць...

Ёсць адрасы. І сярод іх — найпершы,
накрэслены агністасцю радкоў:
сваёй Радзіме прамяніце вершы,
як продкі прыстаўляйце словы-вежы
для ўсіх яе адноўленых вякоў.

## Пакідайце слова на дабрыдзень

І ў журбу
            прамень усмешкі
            прыйдзе;
крыўдзе заступіцеся грудзьмі!
Пакідайце слова на дабрыдзень,
на сустрэчу новую з людзьмі.

Хоча слова не прыбою злога,
не маўчання гневу на вякі:
на дабрыдзень пакідайце слова,
на яднанне ў поціску рукі.

Перад светам,
          бы святлом,
вы станьце —
быццам кроны, быццам карані...
Слова на дабрыдзень пакідайце,
на лучво душы і дабрыні.

## Пабыўка

Вярнуўся. Зноў...
І не раскажаш:
дамоў ты ездзіў не дамоў.
Ды вечнай не бывае пража,
і, абыякавай, любоў.

...Бядуе цётка.
          Кажа: везлі,
ды не давезлі з лесу дроў...
Ужо і хлеба не замесіць...
У вёсцы меншае кароў...

— Прыносяць, праўда,
спраўна пенсію,
і з хаты ў лівень не плыву.
А толькі пенсія —
          не песня,
калі і песня —
          пра ўдаву...

(А як жа быць удовым хатам,
а мо і ўдовым гарадам?)
Пляменнік мой, я не багата —
а кажушок на памяць дам,

бо, кажуць, модная аўчына...
Дык хай жа мода не міне,
хай цёпла чуецца айчына
на ахаладжанай спіне.

* * *

Людзі добрыя, перад вамі
як жа мне расхінуць душу,
каб уверылі, не злавалі,
не казалі, што я хлушу?

Бо ад праўды нідзе не дзецца.
Вось мінецца і градабой...
Што, як здзеквацца
давядзецца
сэрцу чэрстваму над сабой?

Людзі добрыя, золкай долі
вам ніколі б не паспытаць...
Як нямее зямля ад болю:
злому
цяжка
харошым стаць,—

паглядзець чалавеку ў вочы,
паглядзець чалавеку ўслед...
Добрасць —
        лепшы ад нас рабочы,
добрасць —
        лепшы ад нас паэт.

# У ПРЫПОЛЕ ВЯСНЫ

## Прыходзяць пісьмы ад сяброў

Лістоў чакаю ад сяброў,
дзе і навіны, і прыгоды,
дзе ў сіняй мары — параходы
плывуць фарватэрам гадоў,
дзе між паспешлівых радкоў
жывуць лагодныя усмешкі,
дзе кожны сказ — нібы узмежак
для шызакрылых жаўрукоў.

Чакаю пісем дружбакоў.

## Вечар

У вечара зубчастая канва;
не далягляд — сябе я сузіраю.
Злахмачаная
ночы галава
да той канвы схіляецца,
да краю.
У вечара — ні спешкі, ні крыла,
якое нахілілася б раптоўна.
І думкі, быццам лісце са ствала,
нячутна паяўляюцца, гатоўна.
У вечара — глыбокія віры,
Цяпло і золь,
журбота і гарэнне.
І да суцешнай туляцца пары
мае галіны і мае карэнне.
Зжытое...
Недажытае...
Трава
усходзіць на звіднелыя дзялянкі.

У вечара — зубчастая канва,
ды чуць вышэй мярэшнае фіранкі.
Пазначуся там, сённяшні,
хоць тым
(нібы на зразе дрэва пажылога),
як вечара
усплёсквала трывога
і застывала кольцам гадавым.

## Голас

Не трэба ёй гнязда, лаўжа:
адно б — зару густую...
Мая прывідная душа
шум баравы вартуе
і чуе — аж на ўвесь прасцяг,
аж пад віры і кручы:
не кіне ўгору белы сцяг
той голас неўміручы.
Калючым берагам ракі
прабілася на ўзлессе
цераз настылыя вякі
зямлі пявучай песня.
І весні край мой пераняў —
гучальную — нанова.
Як парастак з-пад караня,
маё ўзнялося слова.
А злога ветру халадок
удалеч зneслі крыгі...
1 голас, як душы уток —
замест былое крыўды.
На крылах зоўнага жыцця —
кахання спеў гаручы:
не кіне ўгору белы сцяг
той голас неўміручы.

## Ля абароненай мяжы

Пакланюся салдату кожнаму,
хто ля чорных апаў траншэй.
Дагарала зара над пожнямі
з кожнай хвіляю даражэй...
Чалавек — як лісток па восені.
Чалавек паваліўся вобземлю,—
і яго медальён душы
і па сёння ляжыць гарошынай
На жывучай нашай мяжы.

* * *

Сівыя адлігі —
жытло жаўрукоў.
Сунічныя выспы
ужо ачунелі.
Пад крыламі кнігавак
промні вякоў
празрыста-зялёную
песню запелі.

Карэнне я чую,
я чую лісты,
работу іх вечную
і маладую...
Я чую: да нас яны
ладзяць масты:
і кожны пралёт
як магу я ратую.

## Мяжоўная вежа

Я аднойчы пайду
у заснежжа:
хоць бы ўскраек зары прыручыць.
Маіх летаў

Мяжоўная Вежа
на апошні спамін загучыць.

Загучыць, задрыжыць, заракоча,
разнасцежыць настрашша байніц..
І ніхто тады ўжо не захоча
ўсіх высноў перасудаў, бальніц..,

І я вольны ад здзеклага слова,
ад уроцы, пахвалкі, пустой,—
перайду за ратоўны заслонак,
на збаронены бераг,
на той...

## На беразе бацькаўшчыны

Ячмяні пад яблынямі спеюць,
спеюць яблыкі на ячным полі.
Столькі тут адвечнасці і волі:
Іх і навальніцы не развеюць.
Так і паўтараецца ў прыродзе:
з кораня вядзецца ўсё, з насення.
Вось і я, мацерыка насельнік,
чую карані ў сваім народзе.

## Відзежа

Бывае такое, бывае:
як лета — радок астывае,
здаецца, не вернецца вера,
і засумуе папера.

А слова ў душы ажывае —
прыходзіць відзежа такая:
«З Задзвіння залева сплывае,
Народжаны краем сваім,
лячу над пахучым аерам,
і ўсходзіць да зораў над ім

начлежныя песні і дым...

І я растаю, прападаю,
з Дзвіною, з туманам сплываю».
...Ачнуся у звонкай кватэры:
гукаюць радкі на паперы..

## Перад весніцамі вясны

Мяне не затрымае ростань:
прыйду да весніц нашых росных,
каб зноў пабыць у роднай хаце,
паведаць пасівелай маці
і як жыву, і як пішу,
і ў сэрцы як любоў нашу...
Прыняць прычасце мовы кроўнай,
бацькі мае, я буду ў час...
Пакуль жа — пісьмы пра здароўе
і думы добрыя пра вас.

## Мінае лета

Ці радавацца мне,
ці шкадаваць:
мінае лета, зноў мінае лета,
і яблыка круты бачок нагрэты
шпачкі-гарэзнікі
пачалі кляваць...
Шчымлівы ўчора вечар я правёў.
Ступаў па небе,
на якім зярняты
асыпаліся з ласкавых палёў.
І зноў вярнуўся — пераначаваць.
Да самай хаты
бор за мною следам...
Мінае лета, зноў мінае лета.
І радавацца мне.
І шкадаваць.

## На гары лён...

А песня і не спета.
Прызнаюся, было:
на развітанне з летам
і вогнішча гуло.

І словы неначныя
гулі ля галавы
пра туманы жывыя,
іржэўнік нежывы.

Здаля свіціўся горад,
і аддаляўся ён...
Спявалі песню хорам
пра восеньскі той лён,

пра той бялюткі кужаль,
пра гараванне з ім.
Вастрыўся вораг сцюжы
агонь — праз едкі дым.

У гэтым цёмным лесе
мядзведзь і не рыкаў.
Я толькі чуў, як лезе
світанне праз рукаў.

І ўспомнілася маці
(свірчэў звільжалы дом):
«Нялёгка лён ірваці,
калі няма з кім стаці
пад восеньскім крылом».

## Пацеркі зор

Імчым. Гарача рэйкам.
І звоняць правады.
А мы ўдваіх з Андрэйкам
падалей ад бяды.

Маўчым. Зусім даросла.
Чыя з задум гарчэй?
Ісці ў жыцці — не проста,
і ехаць — не лягчэй,
калі няма вяртання
на ачужэлы двор...
Глядзець удвух мы станем
на пацерачкі зор.
Сынок, даедзем! Суму
не спапяліць надзей.
І выспелім задуму
між станцый і людзей.
Ляцім. Грукочуць рэйкі.
Жыццё вядзе свой рэй.
...Чакальна з-за Андрэйкі
глядзіць у свет — Андрэй.

**Бясснежная зіма**

А дзе, сняговыя палі,
сумётны ваш услончык?
Зіме не кажушок далі —
дзіравы парасончык.
Але паправіць і зіма
характар свой, прагнозы.
Вось нада мной страхі няма,
і на душы — заносы:
падаць баяўся хтось рукі,
хтось верыў нагавору...
Ды не журуся я: сукі
мае растуць угору.
Ім не застацца без кары,
бо на вятрах дужэюць.
І безнадзейна плеткары
цішэюць і глушэюць.

* * *

Як лёгка: чалавеча злы
сышоў з майго суседдзя.
І толькі нервы, як вузлы:
каго цяпер пасець ён?

Бо знойдзе ў дружбу для сябе
і помслівых, і злючых.
Зноў чую: плётачку скрабе
язык яго калючы.

Не дапамогуць ні пасты,
ні весні дух суквецця...
Як цяжка: чалавеча злы
сышоў з майго суседдзя.

**Ля рэчкі Волты**

«Разганюся, занырцую ў вір!
(Памінайце, як мяне гукалі!)
І крупчасты, азалелы жвір
збаламучу белымі рукамі.

У сябрыне юркіх курмялёў
паплыву. Мяне не аклікайце
і стыхіяй новаю маёй
там, на мурагу, не папракайце...»

...Дзівакі. Усе мы дзівакі.
Заімшэлі камяні ля броду.
Да змялелай надышоў ракі
і спіхнуў да водмеля калоду.

* * *

Успамін — з гадамі — гарачэй!
Мой Лявонпаль

вось такім і сніцца —
з баравою сівізной начэй,
смужнаю задухай медуніцы...

Так шчасліва болей не было,
гэтак чыста не звінелі далі:
ўсё ўва мне спявала і гуло,
крылы пад нябёсы выраслалі...

Веру ўсё ж: за глухатой плячэй —
як і родны край мой — азарыцца
баравая сівізна начэй,
смужная задуха медуніцы.

## Адведзіны Прагі

Як пражскі дзень, і я так дагару.
І застануцца горад, плошчы, людзі,
дарога у трамвайным гудзе,
што меціцца на Белую Гару[1]

Далёкая Скарыны старана
заналавее у замглёнай далі.
Каляная калядная струна
замрэ,— і ўсё, усё памчыцца далей

за Белую Гару, званы Градчан[2],
над Віткаўскім узнёслым пантэонам[3]...
Я быў там не апошнім з палачан.
Пабыць бы яшчэ раз там перад сконам!
Але — вярнуцца: да бароў, Дзвіны,
да роднае маёй зямлі-сявенькі,—
пачуць, як з ахаладжанай струны,—
спадзе святло
 па кропельцы
 на вейкі.

---

[1] Поле бітвы 1620 г.
[2] Старажытнейшы раён Прагі.
[3] На Віткаўскай гары знаходзіцца Нацыянальны помнік-музей.

## Развітанне жніўня з летам

Паеду ў свет.
Хай ласкавее лета —
такі пяшчотны, незабыўны час!
Але як цяжка вымавіць: «Паеду».
Лепш неўпрыкмет
я адыду ад вас.

Там, дзе чабор густы,
палын і шчаўе
сабе прытул на дзірване знайшлі,—
пабуду я. А вам я завяшчаю
нязлобнае суседства на зямлі.

Каб ні зласліўцы, ні плеткары
у словы
не надлівалі ачмурэлы яд,
каб светлыя, харобрыя галовы
вялі вас за нязнаны далягляд.

Хай сціхне пыха,
і хай скісне брага,
а подласць вашых не кране граніц!
Бо можна жыць з адною толькі прагай
да чысціні нязрушаных крыніц.

## На юр'еву расу

Нялёгка выходзіць на юр’еву расу:
прабірацца праз лютаўскія сумёты,
праз грамніцы, на якія певень каўтне
першы раз вадзіцы —
каляную кроплю адлігі,
цераз пралескі, сон-траву
і шурпаценькія жменькі сунічніку...

Доўгая да цябе дарога, зялёнае Юр'е.
Цярплівае тваё чаканне —

Пакуль адамкнецца зямля ключамі,
сагрэтымі ў штаніне невядомага каваля.
Нялёгка выходзіць на юр'еву расу.
Нялёгка і потым
пракурлыкаць перад адлётам:

*І я па межах хадзіў*
*Маладое жыта радзіў*
*На цёплыя леты*
*Свае песні гудзіў.*

# ЗАПАВЕДНАЯ ЦІШЫНЯ

* * *

Не прыходзіць світанне:
зарана.
У калодзезі ночы — зара.
Са свісцёлкі забытага Пана
адлятае кара.
А як вусны вятроў дакрануцца
залачальнай трысцінкі,—
то зноў
залапочуць, пад столь узнясуцца
крылы змучаных сноў.
Не, не ўсё ад душы абарвана
скразнякамі турботнага дня!
І журкоча жалейкаю Пана
запаведная цішыня.

* * *

Паклон вясне і першым птушкам,
іх песням у густых гаях.
Паклон Дзвіне, што сіняй стужкай
плыве ў прывольных берагах.

Паклон вам, сцежкі і надгоркі,
вада крыштальная крыніц...
Шчыруе ў нас густы і зоркі
духмень палян, духмень суніц.

І самі мы — Радзімы вешчэ:
адно з другім бліжэй, бліжэй...
За Бацькаўшчыну што на свеце
радней, шчымлівей, даражэй?

* * *

Паэты угаворваюць любіць
дзяцінства кут,
маленькую расінку...
Не збіце вы расінку:
хай звініць!
Не гніце для паклонаў чарацінку.
Такая ўжо ўрадзілася, раса —
святлейшай і крыштальнейшай не будзе.
І лепшая зямлі маёй краса —
людзі.
Навошта іх да шаны заклікаць?
Любіць ці не любіць — змушаць не трэба.
Як можна сыну лепш за сына стаць?
Як можна хлебу лепшым быць ад хлеба?
Такая ўжо ўрадзілася, любоў,
што — прымусовай —
проста быць не можа...
Ў расе звіняць іскрынкі родных слоў
і любяць — нас...
І любяць нас!

* * *

Хочацца ўсё ж дазнацца,
колькі у долі згоды.
Буду заўжды спрачацца
з кожным пражытым годам,
як і з радком хвалебным,
і з пустазельным полем...

Многа пры нас — ад неба,
ды ад зямлі — найболей.

**Лявонпаль**

За аснежанымі барамі

родны бераг крыгай уздыхне.
Ходзіць вечар сінімі дварамі
за Дзвіною тонучы у снег.
Маладзік-ільдзіначка маўкліва
сыпле іней на цяпло навек...
Абеліскам, брацкаю магілай
надзяліў і гэту вёску век

## Гарадская зіма

Мяцеліца кружыць нанова,
І зноў настывае мой двор.
На вуснах сагрэтае слова,
не бойся настуджаных зор.
Як ласку, ля сэрца ўтрымаю,
ад скразнякоў затулю —
адзінае шчасце, што маю,
што светла і свята люблю.
Растануць сумёты настрою,
сумотная хваля сплыве.
Абудзіцца сэрца вясною:
каханаю
мова жыве!
Яе крыгаходы не знеслі,
не стала чужой гарадам...
На вуснах сагрэтую песню
я новым вякам перадам.

## Дарога

Сканала дарога. Зарылі
канавы і каляіны,
і на узбочччы сцежка
сцерлася пад вятрамі.
Доўга палола неба
сляды і людзей, і коней,
тупкага басаножжа
вясёленькія сляды.

Тады і гукнула кнігаўка,
памятушчы летапісец:
«На запаханай дарозе
ніхто з маіх родных і блізкіх
не вывеў яшчэ птушанятак.
Бо кнігаўкі чуйныя чуюць.
Бо нам, асцярожным, здаецца,
што тахкае даўняга шляху,
што стукае на гасцінцы,
трапеча і б'ецца сэрца
забытага бальшака».

## Су-ні-цы!

*Міколу Ермаловічу*

Выспяваюць суніцы
на гальшанскіх мурах.
Тры вякі, нават болей
у кожнай сцяблінцы.
— Дай сунічку! —
І лета духмяніцца пах.
— Дай сунічку! —
І ў склепе калоціцца страх:
на званіцы —
су-ні-цы!
...Дзень гальшанскі
у срэбранай світцы
і па сёння стаіць у вачах.

## Праз тысячу вёсен...

Прыходзяць адлігі гукаць жаўрукоў:
сунічныя выспы без іх пасівелі...
Над крыламі выраю
промні вякоў
блакітна-зялёную песню запелі.

Прайшла і ў карэнні яна, і ў лісты —
мелодыя вечная і маладая.
...Праз тысячу вёсен
сунічны, густы
праталінак водар да нас далятае.

## Цінкаўцы

Як асмялелі шпачаняты-ціўкаўцы:
паспелі гронкі — і няма нідзе!
Заселеныя выраямі Цінкаўцы
мацуюць еднасць птушак і людзей.
З зямлі
усходзяць крылы для узнёсласці.
І думае калгасны старшыня:
«Калі ж (работа — вечная!)
у вёсны йсці?
Дзе юная пяройме цішыня?»
А тут — касьба, а тут жніво,
і — лета бабіна...
Не выветрыцца водар з палына!
Ідзе жыццё, палёгкай не разбаўлена.
Імчыцца годы, і цячэ Дзвіна:
шпарчэй — ці напачатку,
ці ў канцы?
Ды пульс ракі нялёгка вывяраць...
І будзе родных птушак вёска
Цінкаўцы
штогод праводзіць,
па вясне — вяртаць.

## Мой дзень

Мой дзень,
ненаглядны твой воблік,
і час твой бясцэнны ў жыцці.
Таму і не просіш: «На воблу,
на піва мяне ўкараці,

на анекдотную пошласць,
футболазаразную сыць...»
Так можна цябе й на прошласць,
на будучыню ўкараціць!
Бо нехта ў цябе аж угрызся:
«Жывём, толькі сёння жывём!»
Мой дзень!
Дзеншчыкам не окарыся.
Не будзь ты і сам дзеншчыком.
Працуем не дзеля наедку
і не за смачны абед...
Мой дзень!
        У цябе я за сведку,
а ты —
        мой праменісты след.
З табой мы —
        як мачынка дзіва,
з табой мы —
        праростак надзей...
Світае святая радзіма
ў прасветленых зрэнках людзей.

## На вячэру вогнішчу

Чароўная на абдоймішча,
ды поўня не шчыра грэе.
Нясу на вячэру вогнішчу
суччо.
Вечарэе.

Цяпер ужо золь
не закатуе
слова мае заравое.
Бяжыць да агню зыркатага
лета Саракавое.

* * *

Каля млына — гусінае пер'е.
Новы вырай згадае мне зноў
і вясковыя нашы павер'і
і паданні сівых курганоў.

Пасмяюцца замовы і чары
над бязверам халоднай душы...
Налятаюць вятры-янычары
і лапочуць у жоўтай цішы.

## Забыты верш

Прыпамінаю верш забыты,
яго журботныя радкі...
Забыты — горай, чым забіты
і не пазначаны ў вякі.

Бо ў забітага ёсць права
па спісах праўды ўваскрасаць,
ля ацалелых — злева, справа
іскрынкі памяці скрасаць.

Вяртаць сваю душу ў прагалы,
сабою ажыўляць расткі.
Забыты верш, як ліст апалы,
журботныя яго радкі,

што на мяжы той чорнай карты,
дзе толькі нетры небыцця...
Усё забытае — для кары,
успомненае — для жыцця.

## Некаляндарная халаднеча

І не раскрыліў ліпень гронкі ліп —
за позняю вясной, за халадамі.

Над садам, над ваколіцай, над намі
шчаджоных промняў схмараны ўсхліп.
У ліўнях ахалоджана гучыць
не смех прыроды, а яе насмешка.
Каго ж цяпер — яе ці нас вучыць
на вымаклых і зольных галавешках?
І мы — галіны таямнічых крон.
І ў мацярык нам трэба урастацца,
перад прыродай роднай прычашчацца
і непарушны шанаваць закон.
Калі б мы так рабілі ўсе, калі б...
А ліпень не раскрыліў гронкі ліп.

## Поўня над рунню

Асенняя поўня — манета
вялікага княства начы,
пячатка даспелага лета
на богавым сцёртым плячы.
Асенняя поўня — прадонне
спагаднай і светлай душы...
Апошняя кропка ў законе,
суровым законе: «Пішы!»
Асенняя поўня — зярнятка:
крывінкі, расінкі радня,
надзеі маёй немаўлятка,
апошняя продкаў аглядка
на новыя парасткі дня.

## Бераг

Каля Дзвіны ў крынічанцы лазовай
аскому лета юнага гасіў.
І цяжка выспявала ў сыне слова,
нібы імя, якое край насіў.
Але калі ўжо наязджаў са свету,
наслухаўшыся, як пяе сусед,—
між землякоў я адкрываў паэтаў,

і сам я пачуваўся, як паэт.
Мяне гукалі леты на улонне,
каб летапісы дзвінскія бярог...
Як Усяслаў,
дасюль я у палоне
маіх
на бацькаўшчыну выбраных дарог.
І калі дні Радзімы палымнеюць,
дзяржаўны сцяг палае угары,—
тады й на мой маленькі прапар веюць
Задзвіння радаводныя вятры.
І Беларусь крывіцкая аберуч
узважвае сыноўняе крыло:
маю любоў, маю адданасць, веру,—
усё, што вывела мяне
за родны бераг
і што назад на бераг прывяло.

**Лістапад**

Лістападзе, сокал мой, спазніўся:
крылы дрэў у вырай адплылі.
На разлюбленай цяплом зямлі
ліст адчайны са снягамі біўся.

Жоўты ветразь я з ільдзінкі зняў,
на сябрыну з тым лістом ахвочы,
бо й мае насупленыя ночы —
многія — халодны снег заняў.

Так і халадзеем паступова:
кожны з нас каля сваёй мяжы.
І завеяў голыя гужы
каля горла ўюцца, каля слова.

Спадзяемся на запас ад хаты...
А пакуль пакутлівыя ў золь
шарахцяць лісты заўчаснай страты,
лістападаўскі гарчэе боль.

* * *

Заўсёды ты была сама сабой,
(у шчырасці!) вялікая прырода.
А мы? Ідзем на абарону роду
з бяздушнасцю на справядлівы бой?

Ідзем? Ідзем...
Дайшлі да агароду,—
і думаем, што выйшлі на прыроду,
што адарвалі ад сябе прыпой
на сытасць, цеплыню, на моду...

А трэба, смеламу, ісці на бой
за першую патрэбу —
быць самім сабой.

## На Віцебшчыне

Ад Мёрыцы да Волты
зігзагі ручаін.
Бацян, бацян, не боўтай
кужэльны напамін.

Адкуль прынёс найменне,
прызнайся, для мяне?
Было б на хлопца меней
па той, ліхой вайне.

Не вымерлі і Меры.
І Мёрыца вясной
гусіных крыкаў пёры
пранесла пад сасной.

Бацян шукае боты.
Шукаю словы я...
Ад Мёрыцы да Волты
расце бароў сям'я.

## У вырai

Задумалася хатка. А ля веснiц
i след астыў. I голас гаспадынi
зрабiў апошнi круг нiчымлiвы
i з птушкамi у вырай адляцеў.

I толькi застаецца хоць наездам
пад крылы вiшань задзiчэлых, бэзу
ступiць. Журбота-перавясла
сцiсне горла,
каб знянацку песня
замест iмя бабулi Акулiны
не абранiла безназоўны спеў.

Ёй «надаелi вялiкiя снягi,
лютыя марозы надаелi.
Надаела жаркота-пякота,
цяжкая работа — надаела...».

I толькi пракугiча ў соснах цiшыня:
«Спi, мая бабулька, да белага дня!»

* * *

А днi на Юрмале — замешкi
то з аблачыны, то з усмешкi,
з прыбою дужага, з дажджынак,
зажынак песень i дажынак.

Зноў дзень — абветраны i зыбкi.,
З чым буду заўтра заравацъ?
Паднядца хочацца на дыбкi
i сосны Райнiса абняцъ.

* * *

Вялiся (праўда, не кiшэлi)

грашы і грошы ў кашальку.
Былі капейкі у кішэні
на лесу першае «ку-ку».
Таму і выпала удача
(хоць і не вельмі быў я рад)
паслухаць, як на беднасць плача
«бугор» ці юркі тарбахват;
таму і выпала нагода:
гляджу — не сябар, а панок...
Ах ты, зязюльчына пагода:
каб меней бачыць ненарода,—
вясною будучага года
пустым хай будзе кашалёк!

# З ДАЖДЖЫНКАМІ НА ВУСНАХ

* * *

Як жывеце вы, лёзныя словы?
Вы і продкі мае, вы і сестры,
вы травінкі зямлі, вы і вёрсты,
крок апошні і край непачаты.
Як жывеце вы, родныя словы?
— Як усхожыя зернейкі мовы!

## І свеціцца жыццё

Журботнаю лічылкаю
зязюльчына «ку-ку»...
Мае жыццё расінкаю
свіціцца ў каласку.
І не іскрой ілжываю
спыніць мой крохкі крок...
Трымайся, звон душы маёй,
мацуйся, каласок!

На полі бою горкага,
любоў, я твой салдат.
Сярод сяброў і ворагаў
святлела слова «брат».
І я прашу не міласці,
не белай цішыні...
Хачу быць братам смеласці
і братам дабрыні.

Мая адзінакроўная,
мы пройдзем праз асцё,
каб міласэрнай кропляю
свяцілася жыццё.
Ты ратаўніца верная,
калі жыццё — жніўё...

Сястрыца міласэрная —
каханейка маё.

* * *

Прыгледзелася сонца: «Дзе ж зіма?
І дзе сляды дзядусенькі-мароза?»
А дзе ж зіма? Зімы яшчэ няма.
Ёсць толькі маразоў сівых пагроза.

Усё ў чаканні, у пупышках дня,—
як пад карою веснаата лістоты...
...Расце твайго чакання цішыня
з будзённасці, абуднасці істоты.

Раптоўныя завеі паначы
зацерці могуць нашае сумежжа...
І я прыйду табе дапамагчы
прайсці праз гэты нерушавы снежань.

**Ля Дзвіны**

Быў краем свету прыбераг Дзвіны,
дзе камянёў барысавых асколкі
ўраслі ў мурог і шапаткі, і колкі.

Быў краем свету прыбераг Дзвіны:
яго задзірванелае карэнне
і салаўёў ягоных азарэнне...

І вось я зноў ступіў на крохкі край.
Ты не карай мяне, мой бераг кроўны,
мой самы першы бераг і галоўны,

Быў краем свету прыбераг Дзвіны,
а стаў — любові, ростані, віны.

## На адвітанне

Ні слова цяпер, ні радка.
І прыйдзецца гэтак вось жыць.
Нямее рака, як рука,
якая над скроняй ляжыць.

Я крыўду,— як бор, абыду,
аслухаю: помніць, баліць...
Дзялілі расстання бяду,
маўчання бяду не здзяліць.

Цяпер толькі неба адно
палоць будзе нашы сляды.
Але ў яго зорнае дно
зірні калі-небудзь і ты.

* * *

Ля нязмоўклага мора твайго,
шэрахмарая мілая Юрмала,
бераг белы, пякуча-каляны:
ён свіціцца трывогай маёй.
Ён яшчэ — некранутая снежнасць.
Пагранічная паласа
не расцеплена словам сустрэчы.
І чакаю, калі пад прыбоем
схаладнелыя лесу сляды
нашы смешныя межы парушаць.

## Праз некашы

Скашу я мяту —
накрыю хату.
Скашу я сена —
накрыю сені
парожнія.

А лівень хлыне —
схаваю ў млыне,
а гром праравецца —
бліжэй да сэрца,
харошая!

Скасіў я мяту,
а ты — за хату.
Скасіў я сена,
а ты — нясмела...
Хоць «не» скажы.

У палоне слынным
палын за млынам.
І восень носіць
туман за восень
праз некашы.

## Памяць

Помню сполахі дальнія.
Човен мой, не кружы!
Тлее зорка світальная
У прадонні душы.

Пэўна, кожнаму верыцца,
што не будзе смугі...
Хто адважыцца — вернецца
на свае берагі,—

каб успомніць чарнічыну
закаханых вачэй...
Яшчэ годы не злічаны,
яшчэ будзе — гарчэй...

І з асеннімі знічкамі
на чаўны ападзе
тая памяць чарнічная,
што не тоне ў вадзе.

* * *

Мы ўдваіх — перад светам усім.
Нам двaім — гэты свет назусім.
Мы ўдваіх — перад праўдай і злом.
Нам двaім — і зара за акном.

Мы ўдваіх — і бядзе не разнянь.
Нам двaім — і дажджы абганяць.
Мы ўдваіх — як ракі берагі.
Нам двaім — кожны міг дарагі.

Мы ўдваіх — у народа мяжа.
Нам двaім — яго сэрца, душа.
Мы ўдваіх — гэта промняў сям'я.
Нам двaім — неба,
сонца,
зямля!

### «Навечна»

Хай мае схаладнелае слова
прытуліцца да тваёй шчакі.
Не скалыхні яго,
не страсяні, як расінку.
Яго ўзлашч, бы вярбовага коціка:
хай спазнае ў апошнім прытулку —
для чаго гэта людзі з'ядналі,
прыдумаўшы змест ім свяшчэнны,
сем літар:
*н а в е ч н а*

### Заснежжа

Былі праталіны вясны,
а сёння княства белізны
вялікае,
бязлікае.

І церушыцца з-пад аблок
заснежжа на пажары шчок,
і кружыцца.
І рушыцца
маё чаканне, як агонь,
бо белая кладзецца бронь
між душамі...

Патушана
усмешка, кветка і вясна.
Чаго ж чарнее белізна
знямелая...
Ты — смелая?

## Пошта

Ці трэба ўсё гэта, навошта,
каб словы сцюдзёных дарог
прынесла сумленная пошта
на твой паўзабыты парог?

А ноч ачарнелая крочыць,
і зноў углядаецца ноч
у вокан патухлыя вочы...
Сумленная пошта, не збоч!

Гляджу праз гаючыя далі,
узгор'і сцюдзёных дарог,
як словы наўколенкі сталі
на той паўзабыты парог...

## Любасць

Абуджаны вясной
мой патаемны спеў.
І цеплыня нябёс —
мой акрыялы ветразь.

Як мала я зрабіў,
як мала я паспеў
учора... Пазаўчора...
Летась.
І прыйдзецца плаціць
гаркотаю начэй
за страчаны радок,
за нечы крык і лютасць.
Дык стань жа ты, вясна,
ярчэй і гарачэй,—
каб зацвіла званчэй
над полюсам маіх вачэй —
*л ю б а с ц ь.*

## З дажджынкамі на вуснах

Прайшлі грамніцы.
Я вазьму
сок неба прыгублю.
Але ці ведаю, каму
я пракрычаў «люблю»?
І ўсё ж, вясна,
скажы свой тост,
бо мне яго спяліць:
я павяртаюся на мост,
які хацеў спаліць.

## Вязьмо

Хмялела поўня аржаная,
і калыхаў іскрынкі плёс.
А хто — я і цяпер не знаю —
вязьмо салодкай ночы знёс?

Сабраць бы тыя залатыя
заранкі, росы, каласы...
Няма вязьма на маладыя —
сустрэчы, сцежкі, галасы...

А маладзік ускінуў рожкі
на тую песню, што вяла
да апрытомненай дарожкі,
да незабытага сяла.

Хацеў я бегчы наўздагонкі
за той заранкай, каласком...
Але ж — вязьмо: як месяц гонкі
тугім свіціцца паяском.

* * *

Раптоўна выбіла святло —
і гарадок пагас.
Свяча васковая ў жытло
данесла даўні час.
У блізкім полымі свячы
цяплее слых і зрок.
Хачу начы дапамагчы
ступіць апошні крок
да слова светлага акон,
да полымя «люблю»,—
каб можна зноў было на звон
адчаліць караблю,
і, калыхаючыся, плыць,
як ціхая свяча,
ад зоркі, што ў душы гарыць,
аж да твайго пляча.

## Сняжынка

Белыя сняжынкі — у зіму вядуць.
Падаюць на вусны — ціха растаюць.
Не забудзь ніколі гэты слаўны міг:
ціхая сняжынка — толькі на дваіх.
Паглядзі навокал, на абшар лясны:
белыя аблокі — гэта мары, сны.

Зачаруе сіні вечар, лес і лёд,
сіні і асіннік ля маіх варот.
І пакуль іскрыцца чысціня снягоў —
будзе сэрца біцца, будзе жыць любоў.
Не пургу крутую памятае час,
а сняжынку тую, што зрадніла нас.

# У ВЯНОК МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

* * *

Зусім не там,
дзе Бацькаўшчына-свет,
дзе памяць крылы родныя люляе,—
за мной хістаецца няўцерпны след
і ззяе.
Я тут яшчэ не корань, не расток,
не аблачына над спякотнай стромай...
Я ў беларускі срэбраны уток
уткнуся толькі пасмай невядомай.
А не прызнаю здрады, і маны,
і хітранькай іклівай раўнавагі.
Я ведаю: жывуць зямлі сыны,
як рыцары сумлення і адвагі.
Дык будзь, Радзіма, плоднаю на іх,
абарані наслаблага няверу...
Праз думныя легенды і паверы
лячу да зораў будучых тваіх.

* * *

Журботлівая ноч
пад засенню Каўша.
Сляжэе нада мной
размоўная душа.

Пытаецца пра лёс,
пра хлеб надзённы мой,
ці высака святло
над роднай стараной...

А як мне не зманіць,
як праўду перадаць?
Святло мо падмяніць?

І крыўду не згадаць?

Відаць, не змоўчу я,
сябе на суд аддам
вясковай грамадзе,
суцешным гарадам.

А поўніца Каўша
чакальная — са мной...
Якая глыбіня
у вышыні начной!

* * *

На папірусе светлай ночы
пакідае свяшчэнны запіс
адзіны жывы летапісец
багдановічаўскі Маладзік
і назначае сабою
на небе натхнення нашага
адзін толькі знак прыпынку
коску

* * *

Вечар у Ялце. Настыла папера.
Не падыходзіць паэт да акна.
І над Ай-Петры смуткуе Венера,
як пры Максіме — адна.

Максіме, Максіме, жыве твая вера
з абуджаным імем — Вясна.

Зорка Кахання і зорка Расстання —
помнік паэтавай горкай душы:
полымя памяці — не, не растане
ў зорнай касмічнай цішы!

Максіме, Максіме, ў краіне — світанне:

скажы сваё слова, скажы!

Вечныя — песня, любоў і радзіма.
І несмяротнасці верны зарок —
слова Максіма і зорка Максіма,
зоркі праніклівы зрок.

Максіме, Максіме, за бухтаю сіняй
звініць твой абуджаны крок.

* * *

Прыязджаем. Ад'язджаем.
Застаешся.
Любым словам ці падумкай
памянешся.
Бо адлегласці пашане
не пярэчаць.
Касачы
і кіпарысы тваё лечаць.

Летапісец
нашай вернасці і дзеі,
у вяках сваіх нашчадкаў
абнадзейвай.

І сягоння падтрымай,
калі мы варты,
нас, паломнікаў
тваёй пякучай Ялты.

* * *

Жыву ля ног у гор:
часовасць — не пакора.
Плыву, як той вугор,
з Саргасавага мора.
Ай-Петры нада мной,
прылегла побач хваля.

І сонца
белізной
палац наш атуляе.
Расце прыбой дарог
за супакоем сэрца.
Калі ж твой, Крым, парог
над сонцам разамкнецца
і ляжа сцежкі шоў:
вяртання сум і стома?
Пад кіпарыс прыйшоў
і слухаю: я дома.

* * *

Дзе ўпоўніцу святла, цяпла
упружжа хваль заўзятых,—
прыходзяць на парог жытла
страты.

Не вымкнешся, не паляціш,
не прынясеш збавення:
неапрытомненая ціш —
у сэрцах і каменнях.

І чуць пульсуе жарало
паўвострава кахання.
Для ўсіх — святло, для ўсіх — цяпло,
для аднаго — змяркание.

Мяжа вады, мяжа зямлі
ля нашых меж клакоча.
Прынесла страта халады —
і адпускаць не хоча.

Свіціцца воблік родных рыс
у плыні страт бясконцых.
Адно званчэе кіпарыс
над макавінкай сонца.

* * *

На скалу ці на каменьчык
сон бяжыць разоркаю?
Я спынюся — і укленчу
перад зоркаю,

перад Поўначчу далёкай,
перад продкамі...
Ноч бяссонная, галёкай
зморанымі глоткамі.

Акружай цямрэчу мора
зыркімі зарніцамі.
Што не сплю — яшчэ не гора.
Шчасце, што не спіцца мне.

Кліча, кліча мяне Поўнач,
зоркі у Дзвіне...
Хоць маленечкая помач
будзе і з мяне!

* * *

Вось тут і край зямлі,
і выраю пачатак.
Адвеку тут з дзяўчатак
смуглявачкі раслі.

І я пад сонца йду,
вяснушчата смуглею
і маладзіць умею
крыштальную ваду.

Ты выпі за любоў
узвоністыя росы.
І хай гадоў пракосы
зазелянеюць зноў.

Не трэба спамінаць,

што побач — край сінечы...
Як доўга будзе нечы
тут зоўны кліч лунаць.

Прапаў бы ён, калі
вятры б не сцалавалі...
Усцешымся, што звалі
і нас на край зямлі.

* * *

*«Хоць зернейкі засохшымі былі,*
*Усё ж такі жыццёвая іх сіла*
*Збудзілася і буйна ўскаласіла*
*Парой вясенняй збожжа на раллі».*

*Радкі Максіма Багдановіча,*
*накрэсленыя на яго магіле ў Ялце.*

Шэры камень растаў у начы.
А над ім кіпарыс растае.
Не журыцеся, вочы мае:
тут маркотаю не памагчы.

А сумленне спытаецца ў нас:
ці шануем другіх і сябе,
як усходзіць у новай сяўбе
тое зернейка ў радасны час?

Дакранемся рукой да асноў
светлай веры... Зноў дзень настае.
Не журыцеся, вочы мае,
не турбуйце паэтавых сноў.

## Імгненні

Навыперадкі — дні.
О, як звіняць іх звенні!
Спыніцеся, імгненні
натхнёнай цішыні.

Я промніста згару,
пакуль жыву ў натхненні.
Спыніцеся, імгненні,
ў чаканую пару.
Хай патаема слоў
ўрастаецца ў каменні.
Спыніцеся, імгненні,
на доўгую любоў.
У благлавёны міг
знікаюць злыя цені.
Спыняюцца імгненні,
але ўжо на дваіх.
Каб не парваць звяна,
не ўпасці на калені,—
спыніцеся, імгненні,
і станьце, як сцяна.
Мы зноў на вышыні.
О, як звіняць праменні!
Спыняюцца імгненні
і падаўжаюць дні.

* * *

Аэрапорт.
Мой самалёт на веча
з далёкага удзелу прыляцеў.
Табе сказаў усё,
але на вечар
пакінуць слова лёзнае схацеў.
Расстанне наша,
як мяжа, залела.
І вось мы зноў
у лета увайшлі.
Дзяржава двух,
я веру, ацалела,
і каласуюць любасці палі.
Прымі мяне як тайную замову
і промнямі сваімі спавяжы.
Я сэрца зазямліў,
я прыляцеў дадому,

на Бацькаўшчыну схмеленай душы.
Аэрапорт
яшчэ дрыжыць у жылах.
І неба забываецца на міг
на наш саюз,
так радасна ажылы,
на веча —
		так чаканае! —
		двах.

* * *

Максім Адамавіч!
Я ад Цябе, здалёк
дамоў вярнуўся...
Памяць-вугалёк:
і зноў Тваё імя душой спажыта.
Іду Айчынай.
Лета — да аблок...
Уросся ва узмежак васілёк,
і ля яго дабрэе наша жыта.

## ТОЛЬКІ АДНО ІМЯ

*Памяці Невядомага паэта Беларусі*

*І не так даўно была размова з Эйжэнам*
*Вэверысам — у Доме творчасці ў Дубултах.*
*Запытаўся ў латышскага настаўніка*
*і паэта, былога вязня фашысцкіх канцлагераў*
*у Саласпілсе, Штутгафе, Маўтгаўзене*
*і пра тое, а ці не сустракаў ён на сваім доўгім*
*і нялёгкім шляху каго-небудзь з маіх землякоў...*

Саласпілс.
Верас вымерз.
Мох на кары абмяк.
Нам нагадайце,
Вэверыс,
толькі адно імя!
Вам з крэматорнага пекла
выйсці ўдалося да нас.
Хай жа забыўлівасць
здзекліва
той не сцірае Час!
Верылі ў памяць вязні,
ў памяць сярод людзей.
У багне канцлагераў вязлі
нават і промні надзей.
О, як на плаху зняверу
падаюць душы кульмя.
Нам нагадайце,
Вэверыс,
толькі адно імя!

* * *

Спеўны бурштынавы край.
Райніса сосны нязломныя.
Ліпеньская пара —

зоўная і нязлоўная.
Зноў пацішэў прыбой.
Радзеюць бурштынкі-госці...
Як саўладаць з сабой,
з новым прылівам горасці?
Бо і дасюль у нас
раны не ўсе залечаны.
...Нашы імёны, Час —
вечныя! вечныя! вечныя!
Вып'е зямля ўсю кроў,
смерць нада мной не зжаліцца,
усцешна, калі між сяброў —
знаю: імя прадаўжаецца.
Прымуць байца груды,
залпы ударацць вызздалана...
Уцеха, што знаю, куды
была пахавальная выслана.

* * *

Дубулты. Сёмы наверх.
Мора спакойна-пукатае.
Добры настаўнік, паверце:
просьба мая далікатная.
Вось вы сказалі — жыў
смяротнік у нескаронасці.
За далягляд заплыў
вязень у безназоўнасці?
Хвалі плывуць кульмя.
А над узмор'ем полудзень.
З памяці знікла імя...
Што ж вы тады успомніце?

*Саласпілс, канец XII ст. Нямецкія рыцары ўзвялі тут замак і каменную царкву, У ёй запальвалі васковыя свечы. Воск гэты бралі з борцяў на квяцістых лугах ля берагоў Дайгавы. Гарэлі свечы, і пры іх бласлаўлялася зброя, з якой крыжакі*

*ішлі на Усход, каб захапіць новыя землі,*

У царкве каменнай мёду, воску пах.
А у рыцара — усмешка на губах.
На крыжы яго, на латы — курадым.
Дым ад свечак, не ад хатаў дым.
Столькі вулляў на лугах каля ракі!
Благаслаўляюць сваю зброю крыжакі.
І васковая пахучая свяча
асвятляе джала хцівага мяча.
На лугах, каля мядовых сот
пройдзе новы блаславёны іх паход.
І багаты будзе замку медазбор:
ўлада замка ад карэньчыкаў да зор!
О, зямля! Ты свае кветкі патушы,
свае вуллі, свае соты акружы.
Крыжаку не выдавай нектару дар,
свой агонь ты не нясі ў яго алтар.
З тваіх вулляў, з тваіх сотаў
светлы пах...
А у рыцара — усмешка на губах.
Ты ў пяшчоце рэчак, пожняў і лясоў,
ну а ў рыцара — халоднае лязо.
Ты — агонь: з ім нараджаешся, гарыш...
Крыжакі ім асвячаюць чорны крыж.

*Саласпілс, XX ст. Міервалдыс*
*Берзіньш-Бірзэ: «Сёння шлях да*
*Саласпілскага мемарыялу кароткі, але*
*няма ў Латвіі іншай дарогі, па якой*
*насустрач сваёй смерці прайшло б столькі*
*людзей... Прайшлі гэтай дарогай тысячы*
*беларускіх жанчын, дзяцей, старых...*
*Іх смерцю хацелі супыніць тых, хто са зброяй*
*у руках уздымаўся на барацьбу супраць захопнікаў».*

Кветка шыпшыны,
колкай шыпшыны —
вочы дзяўчынкі,
вочы хлапчыны.
Вочы Асвеі,
            Бігосава,

Дрысы...
Мілыя рысы,
пякучыя рысы.
Краты нябесную сінь дратавалі.
Дзеці Асвеі дом малявалі.
Дом, што даўно ўжо
згарэў на вуголле:
вёска іх родная —
чорнае поле.
Краты нябесную сінь дратавалі.
ў Рызе эсэсаўцы
джын распівалі.
Як балявалі,
як распраналі,—
вочы Бігосава
ноччу не знала.
Зналі
уніжаныя жанкі
ворага шторавыя шынкі.
Краты нябесную сінь дратавалі.
Хлопчык з-пад Дрысы,
цябе прадавалі?
Цябе адрывалі
ад маці, ад сёстраў.
Гаілі каросту.
На хутары млосным
ты з імем чужым
мёў панадворак,
чысціў нажы...
Краты нябесную сінь дратавалі.
Тысячы, тысячы...
Зоры рыдалі,
зоры Асвеі,
Бігосава,
Дрысы...
Родныя рысы,
суровыя рысы.
Знаю: зямля мая —
сэрца камочак.
Пульсуе жыццё.
Не жыццё — вузялочак.

Быў чалавек
да крыві, да вайны...
Стрэл! І няма ні яго, ні віны,
нават забойцы
няма між людзей.
Толькі шыпшына
ў мяне ля грудзей.
Як паланялі
азёры, лясы!
Як пацяшаліся
з юнай красы!
Пільна сачылі,
петлі сучылі,
смерцю і полымем
жыць нас вучылі.
О, Беларусь!
У вяках не забыць,
як твае вочы
хацелі сляпіць.
Песню глушылі, ішлі
напралом,—
толькі б не роднае слова
у дом.

*Эйжэн Вэверыс успамінае:*

— Партызан, у лясах забраны...
Там, дзе з намі зямля стагнала,
незагойныя яго раны
дружба нашая сагравала.
На нязвыклай для многіх мове
ён чытаў тады верш за вершам...
Беларусаў я знаў даволі,—
партызанскі паэт быў першым.
З ім прайшлі мы Штутгафа церні,
мы ў адным з ім бараку спалі.
А калі ўжо было нясцерпна —
людзям вершы свае чыталі.
Бо інačай як можна выжыць,
не згубіць чалавечы воблік?

У няволі сядзець, як мышы?
І душой сваёй — у няволі?

* * *

Невысокага росту, жвавы...
Патрыёт. І ў бядзе не скарыцца.
Беларусі незваяванай
быў між намі ён, мужны рыцар.
У Маўтгаўзене, з каменаломняў —
за адзін год
да перамогі,—
не вярнуўся пад сонца промні,
ў нашы радасці і трывогі.
Адышоў ён. Не адвітаўся.
Дым зацісну ў яго павекі.
У Маўтгаўзене і застаўся
партызанскі паэт навекі.
...Дні і ночы ў калейдаскопе.
Столькі жыццяў і столькі смерцяў!
Хоць вачэй не забыць да скону,—
не запомніў імя... Паверце.

Толькі адно імя.

Жальны час. Вечарэе мора.
Супакоімся, сведка знаны.
Незабыўнае наша гора —
лёс апалены, зруйнаваны.
Вораг ведаў, што памяць —
зброя,
зброя — новаму пакаленню.
Са шматлікае раці герояў
выпадалі імёны-звенні.
Каб зняволіць душу і памяць,—
у законе
фашысцкі метад:
вораг кнігі і хаты паліць,
камянямі душыць паэтаў.

У музеі Саласпілскага мемарыяла
архіваў няма: яны знішчаны фашыстамі –
разам з канцлагерам, разам з людзьмі...

Прылада смерці —
куля і пятля.
Прылада смерці —
штых, прыклад, асколак...
О, як пячэ,
адсвечвае здаля
вайны пяколак.
Прыладай смерці
быў бліскучы шпрыц,
фашыст хітружны
быў прыладай смерці.
І немагчыма на планеце
сцерці
крывіначку,
дзе нехта падаў ніц.

І я адпраўляюся шукаць імя паэта на
яго радзіму, у Прыдзвінне, у былую
партызанскую зону...

Іду Асвейшчынай.
Вітаюць,
на пачастунак запрашаюць:
што дню патрэбна —
людзі маюць.
Старонняму ж — ці зразумець?
Стаяла хата, восець, клець...
А ўжо крапівай парасло
і полымя, што тут гуло,
і думка жудасці «канец...».
Апошні Росіцы вянец
пасля пайшоў у звон Хатыні.
Там чалавек на полі стыне.
А тут Хатынь —
на грузавішчы.
І вецер у шыпшыне свішча.

І душы матак і дзяцей
тут адгукаюцца
часцей.

Зварот да ацалелых жыхароў былой
партызанскай зоны.

Бабулі...
Цётухны...
Дзядзькі!
Вы мне прабачце,
што турбую,
што вашу бедачку любую
я не хаваю на замкі.
Хоць вашы годы, бы вякі,
ад непагоды не ўратую,
але за словам я іду
у ваша горкае вяртанне,
дзе ў дыме, полымі
дыханне,
дзе сэрца стыне на ляту,
дзе толькі крок у бок —
Ні дум,
ні ветлага імя — не стане.
Бабулі,
цётухны,
дзядзькі!
Слязіны вашыя збіраю.
Я й сам, як Росіца, згараю,
лячу у лес, і заміраю,
і чую: рукі, як сукі...
У Саласпілсе замярзаю...
Нялёгка несці боль гаротны,
парушыць болю берагі,
калі дрыготкія кругі
страсаюць сэрца.
Дух народны
нязгодай з ворагам — нязводны.
І дружалюбствам — дарагі.
Бабулі,
цётухны,

дзядзькі —
народа крона і карэнне...
Мае, як песня, пакаленне
з-пад вашай выбегла рукі.
...Заву я ў зольныя радкі
святое вашае сумленне.

Ад былой вёскі Каменцы засталіся тры хаты... Няма кану ўспомніць пра чалавека...

Як помнік вёскі,
дакор гадоў —
і тры хаціны,
і сем удоў.
Уся работа,
цяжар пудоў —
на тры хаціны,
на сем удоў.
І страта ласкі,
і страта сноў —
на тры хаціны,
на сем удоў.
Пісьмо прыбудзе,
кліч гарадоў —
на тры хаціны,
на сем удоў.
Удовы цешаць удовін век.
І слёзы веку — з-пад іх павек.

Што магла сказаць пра партызанскага паэта вязень Саласпілса Валянціна Пілюшына? У 42-х дварах яе родных Ліпавак жыла радня. Адна засталася з усяго роду...

Калі сплывае даўняя трывога,
высновамі мне трэба даражыць:
не толькі за сябе на свеце жыць,
але яшчэ за некага другога.
Бо мая радасць, воля і парыў
з апошняга паўстала крыку:
— Ма-ма!

Ніколі не забыцца той пары,
калі агнём Радзіму абдымала.
Напамінаюць маем салаўі
дзівосны лёс твой,
любы мой Народзе:
быў подзвіг,
як ты гінуў у баі,
што жыць застаўся —
твой няменшы подзвіг!

Надзея Рыгораўна Кіпіч, былая выхаванка
Саўлкрасцкага дзіцячага прытулку ў
Латвіі, доўгі час не ведала нават свайго імя...

Вачанятамі брат заззяў:
нейкі дзядзя
загроб з кудзелі.
А мяне аніхто не ўзяў:
на прапашчую не глядзелі.
Залатушная, чуць жыла,
без крывінкі —
лустыя жылы.
Не хапіла мне маці...
Прайшла...
Неба сіняе затужыла.
Неба сведкам маім было,
як рыззё на спіне пякло.
І магло толькі ведаць неба:
больш, як маці —
хацела хлеба.
Не хапіла і хлеба мне.
І Асвея мне ўжо не сніцца.
Скоса глянула на акне
прыхарошаная сініца.
Дзе прытулак
і дзе любоў
для такіх, як і я,
сястрычак?
Гэта з нашых раслі ілбоў
сінякі, і гузы, і пстрычкі.
І з сіроцкае долі рос

шлях далёкі
і блізкі самы —
да асвейскіх маіх бяроз,
да пакутнай, сапраўднай мамы.
...Сто дарог на маім вяку.
Я гляджу цяпер на дачку:
не аддам ёй
любой цаной
ні адной сваёй, ні адной.

Васіль Скрыпка, прыёмны сын рыжанкі
Ксеніі Урублеўскай з ванны запомніў адно:
як яго ўратавалі ад смерці...

Яшчэ і сёння дзецюкі
са свету ў Рыгу наязджаюць
і ратаўніц сваіх вітаюць,
цалуюць зморшчынкі рукі:
іх ратавалі, гадавалі,
на параходы не здавалі...
Акрыленага хлапчука
сцішала цёплая шчака.
О, колькі вернута дамоў
асвейскіх, росіцкіх сыноў!
Цяпер у іх свае сямейкі.
Не мружыць памяць іх павекі:
бо ў Рызе мацеры жывуць,—
яны іх — роднымі — завуць.

У Ядзвігі Гяч з Бігосава была свая бяда:
як знайсці сына, якога вырвалі з яе рук
у Саласпілсе...

Вайна не толькі сына адабрала.
Яна бядой страшэннай пакарала.
У горле сына
слова — камяком,
якое увабраў ён з малаком,
якое з ласкай матчынай рукі
было наканавана на вякі.
Яно злілося з сэрцам, і душой,

і з першай калыханкай, і зычэннем...
Скацілася
          над ногі
          ледзяшом,
дыхнула чужыной і задзічэннем.
У маці грудзі
у хадзе нямеюць:
бо сын іі маці размаўляць не ўмеюць.
Куды ісці?
Неразуменне — смерць...
Як людзям
          усё гэта
          зразумець?
І як вярнуць у немату быцця
заранiчку гучальнага жыцця!
І маці просіць неба:
— Не скары!
Дажджом і промнем з ім пагавары!
Да ручая прыйшла:
— Не падвядзі!
Струменьчыкам, чаротам абудзі!
...Каля зямлянкі сын сказаў:
— Зям-ля...
...Нішчымніцай вячэрала сям'я.

Пётра Уселенак, аказваецца, ішоў тымі ж
крывавымі шляхамі фашысцкай няволі,
што і партызанскі паэт, ды маладому
саласпілскаму паўстанцу не пашчасціла з ім убачыцца...

Як жа можна навучыцца здрадзе?
Быць прадаўцам?
Быць паслугачом?
Сэрца абакрыю кумачом,
бой прыму
у вашым я атрадзе.
Мілыя падлеткі-бацянкі,
гледзіцё чакальнымі вачыма.
Ё с ц ь! Ж ы в е!
Мацуецца Айчына,
бронзавыя выклаўшы вянкі.

Ваш ваяцкі я лаўлю сігнал,
ведаючы, як сцягі брынялі...
Паласкоча вечнымі агнямі
наша памяць — грозны арсенал.

Высновы з дарог...

Я думаю пра твой палын,
незаараная Асвея.
Пра слоў гаркотлівы нахлын
і халаднеючае
«дзе я?».
Пытанне ў самую пару.
Каб адказаць, у глыбку лезу:
кавалкі шорсткага жалеза
на гарадзішчах я бяру.
Калі прыходзіў час адкрыцца,—
Айчына пад крывавы пот
каліла і кавала крыцы,
а шлак выкідвала на под.
З металу крычнага майстры
аздобу выраблялі, зброю...
І за асвейскаю гарою
пылалі горны і кастры.
Праз гораны прайшоў народ.
І кожны крыцаю іскрыцца!
І славай можа абакрыцца
ля лесу — дом,
у рэчкі — брод...
Калі спытае нехта:
— Хто ты?
Адкуль?
Каму твой служыць дзень? —
таго з вялікаю ахвотай
да крычных выпраўлю людзей.
І хай ён толькі не збаіцца
такога лесу, даўніны...
Асвея
яшчэ й сёння
крыцы
збівае з водгулляў вайны.

Зварот да зялёнай бярозавай галінкі...

Ты, бяроза, лісце не зрані,
каб не ляскалі галінкі цэўкамі.
Што куркі на ўзводзе — карані:
чуйныя,
          і пільныя,
і цэпкія.
Ваявала кожнае жытло,
ваявалі бор, залесае, параснік...
І бярозу курчыла, пякло,
а камень яе смылеў і парыўся.
Лёс такі ўжо гэтае зямлі,
што аднолькава
бядой нявечыла
душы хатаў,
          пушчаў,
          аралі
з лёзнаю душою чалавечаю.
Ды не зрушыў душы ледавік!
Зноў краіна песнямі засялена:
пад карэнне вораг не пранік.
І бярозу
          свеціць сакавік,
і зямля
          надзеямі засеяна.

Зварот да Невядомага паэта.

Ты — салдат наш мільённы.
Невядомы паэт,
мо праз краты, праклёны
скажаш свой запавет?
Барацьбітны і зоўны
мо прашэпчаш пароль?
Мы жывем светлазорнай,
ды не соннай парой.
Вылятаюць, як знічкі,
з неба памяці — дні.
Вечны дух ваяўнічы
не скарыць цішыні...

Партызанскі паэт:

— Не стрываць было болю
ад каменняў, ад куль:
не хаваўся ніколі —
хто я ёсць і адкуль.
Не шукаў несмяротнасць,
вашых памятных слоў...
Верыў: жыць будзе роўнасць
і Айчыны назоў.
І не быць мне бяздомным
(хоць не трапіў у рай),
як не быў Невядомым
і не будзе наш Край.
Дзе б людзей ні душылі
і мярцвілі сільмя,—
а з крывёю у жылах
не знікае імя!
Будзе памяць як неба
Шляхам Продкаў гарэць.
Толькі справам ганебным
і насуджана тлець.
Нада мной з Беларусі
гусі не пралятуць...
Можа, я не збяруся
гора-камень скрануць.
Не мая тут прычына.
Я быў ваш — да канца.
У назове Айчыны
несмяротнасць байца.

Суцяшэнне... Супакаенне... Роздум...

Прыбой бяды сціхае неўпрыкмет.
Мы думаем пра заўтрашнія святы.
Але...
Ідуць
радамі, след у след,
пад абеліскі зорныя салдаты.
І нам ужо кліч бою не чуваць...

Гадуюцца,
смяюцца нашы дзеці.
Ім і зязюлі будуць кукаваць,
і салаўі засвішчуць на дасвецці.
Так і жывём
на гэтым дзіўным свеце,—
бо толькі нам,
як повязям,
яднаць
надломленае і жывое вецце.

Зварот да Бацькаўшчыны.

Дзе пантэон твой, Краю родны?
Дзе спяць найлепшыя сыны
хаця б з апошняй той, паходнай,
і непаходнай той вайны?
Ёсць пантэон: Хатынь і зоркі
каля вясковых жураўлёў,
ля Гдыні чорныя пагоркі,
і Равенсбрука дым прагорклы,
жуха асвенцімскіх палёў...
Сканаў Бядуля за Уралам,
Купалу адняла вайна...
Бы ў чорны мех яна ўбірала.
А колькі потым памірала,—
не скажа й доўгая Дзвіна.
Са свету белага надгробкі
ніколі нам не пазбіраць.
А ўжо страшыцца век таропкі
нейтроннай смерцю паміраць.
Дык хай з нас кожны не забудзе,
хоць як бы памяць ні гняло:
за нас ішлі на бітву людзі,
і дзе б, і колькі ні лягло,—
для іх, для нас ратоўным будзе
Радзімы ўзнёслае крыло.
Наш пантэон — да межаў зорных,
аж да апошняга грудка,
дзе абрывалася няскорна
жывая жылка земляка.

Перад хвілінай маўчання.

Так, ён з намі, баец-прадвеснік.
Ваяўніца, не безназоўны,
бо змагарныя нашы песні
не забыты ў палётах зорных.
Ёсць вялікі — навек —
адзіны
помнік воінам:
П е р а м о г а !
Пралегла да імя Радзімы
несмяротная іх дарога.

Зварот да тых, каго няма...

Хто з вогненных вёсак
пад небам скарэлым
да дрогкай надзеі
душу прытуляў,—
данёс да нас памяць:
пажары і стрэлы...
Хатыні ён праведным
гневам прakляў.
Ды толькі Хатынь
ацалеламу люду
начаткам была
апраметных дарог.
Не зжаліўся вораг
і здраднік-адлюдак,
і нават не зжаліўся
клікaны бог...
Бігосава — Саласпілс,
Рыга — Майданак,
Маўтгаўзен, Асвенцім,
Дахаў, Равенсбрук...
І горкі, пустэльны,
вяртальны світанак,
дзе сыплецца зерне
счарнелае з рук...
Ад цёмных зямлянак,

запрэжак жаночых,
удовіных песень,
удовіных мук
на старт Кавалёнак
рашуча пакрочыў,
і тройчы груз космасу
зведаў Клімук...
Такую зямлю
ад пясчынкі да кроны
змясціць у душы
мо яшчэ не гатоў,—
а вочы прымружу:
бліскочуць патроны,
завуць недажытыя
гронкі гадоў...
У доўг не магу жыць
на здораным свеце,
і повязь суцэльную
каб не парваць,—
прашуся да вас,
землякі і суседзі,—
пад аграмаднаю
ношаю стаць.

З абярэмам цішыні.

Неба стыне, і поўня звініць.
І дрыготкія чуюць ірвы:
успамінаў нацятая ніць
задрыжэла на лапках травы.
Не сумуй, аржаны ветравей:
можна крэўную казку вясны
напісаць на балючай канве
і Дзвіны, і сцяны, і сасны...
Не згасае, не згасне імя:
партызаны...
франтавікі...
Не імгненні плывуць, а вякі.
Я наддзвінскую клічу зару:
з песняй памяці я не згару,—
адплываю ў надзейныя дні

з абярэмам зямной цішыні.

Эпілог.

Нашы святыні я не мінаю.
Поле Хатыні у с п а м і н а ю .
Час неласкавы, раны і страты,
вецер гаркавы, годы і даты,
Вечную плошчу, Бацьку Міная,
хлебную крошку у с п а м і н а ю.
Тое, што чуў я, тое, што знаю,—
светла і чуйна у с п а м і н а ю.
Ноч — для развагі, золак —для болі.
Зноў я— адвагі зорнае поле.
Памяці порах перамінаю...
Край непакорны у с п а м і н а ю .

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

**ЗМЕСТ**

**МАЦЯРЫК**


Радзіма
Сустрэча сяброў
Ля хаты Луцэвічаў
Над Нёманам
Купалле
Мацярык
Багрым
Промні памяці
Скарына
Мацей Бурачок
Язэп Драздовіч
Ліпы Альбы
Зоська Верас
Любоў
Ян Судрабкалн
Расінка
Дзін Рыд
Купалаўская струна
У старажытным леце
Школа
*** Салёная раса
Народ
Сябры
Тост
*** Усміхаліся паэты
Паходня
1942
Пабрацімы
Кліч продкаў
Трубы Гародні
Камяні
Суседства
Вільнюсу
Івянец
Севастопаль
Раёны ветлівых бабуль
Да музаў
*** Няма старонак у жыцця
Маладзейшым
Пакідайце слова на дабрыдзень
Пабыўка

*** Людзі добрыя, перад вамі

**У ПРЫПОЛЕ ВЯСНЫ**

Прыходзяць пісьмы ад сяброў
Вечар
Голас
Ля абароненай мяжы
*** Сівыя адлігі
Мяжоўная вежа
На беразе бацькаўшчыны
Відзежа
Перад весніцамі вясны
Мінае лета
На гары лён
Пацеркі зор
Бясснежная зіма
*** Як лёгка: чалавеча злы
Ля рэчкі Волты
*** Успамін — з гадамі — гарачэй!
Адведзіны Прагі
Развітанне жніўня з летам
На юр'еву расу

**ЗАПАВЕДНАЯ ЦІШЫНЯ**

*** Не прыходзіць світанне
*** Паклон вясне і першым птушкам
*** Паэты угаворваюць любіць
*** Хочацца ўсё ж дазнацца—
Лявонпаль
Гарадская зіма
Дарога
Су-ні-цы!
Праз тысячу вёсен
Цінкаўцы
Мой дзень
На вячэру вогнішчу
*** Каля млына — гусінае пер'е.„
Забыты верш
Некаляндарная халаднеча
Поўня над рунню
Бераг
Лістапад
*** Заўсёды ты была сама сабой

На Віцебшчыне
У выраі
*** А дні на Юрмале — замешкі
** Вяліся (праўда, не кішэлі)

**З ДАЖДЖЫНКАМІ НА ВУСНАХ**

*** Як жывеце вы, лёзныя словы?
І свеціцца жыццё
*** Прыгледзелася сонца: «Дзе ж зіма?»
Ля Дзвіны
На адвітанне
*** Ля нязмоўклага мора твайго
Праз некашы
Памяць
*** Мы ўдваіх — перад светам
усім…
«Навечна»
Заснежжа
Пошта
Любасць
З дажджынкамі на вуснах
Вязьмо
*** Раптоўна выбіла святло
Сняжынка

**У ВЯНОК МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ**

*** Зусім не там
*** Журботлівая ноч
*** На папірусе светлай ночы
*** Вечар у Ялце. Настыла папера
*** Прыязджаем. Ад'язджаем
*** Жыву ля ног у гор
*** Дзе ўпоўніцу святла, цяпла
*** На скалу, ці на каменьчык
*** Вось тут і край зямлі
*** Шэры камень растаў у начы…
Імгненні
*** Аэрапорт
*** Максім Адамовіч!

**ТОЛЬКІ АДНО ІМЯ**

Толькі адно імя

Панізнік С.
П 16 Слова на дабрыдзень: Лірыка.— Мн.: Маст, літ., 1982.— 110 с., іл.

Творчае крэда гэтай кнігі паэт перадае наступным чынам: «Маці аднойчы сказала: трэба з людзьмі жыць так, каб заўсёды заставалася слова на дабрыдзень...» Гэта значыць, каб кожная сустрэча была шчырай і цікавай, каб кожны чалавек клапаціўся аб росквіце Радзімы.

П 70403-026
М 302 (05)-82 61—82

Сергей Степанович Панизник
СЛОВО ДЛЯ ВСТРЕЧИ
Лирика

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке
Рэдактар Хв. М. Чэрня.
Мастак Ю. П. Герасіменка.
Мастацкія рэдактары А. М. Малышава, А. І. Труханава.
Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч.
Карэктар А. А. Бачанкова.

ІБ № 1579
Здадзена ў набор 07.08.81. Падп. да друку 04.12.8.1. АТ 07692. Фармат 75X90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 4,38. Ум. фарб.-адб. 4,68. Ул.-выд. арк. 4,47. Тыраж 5000 экз. Зак. 1853. Цана 55 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскае вытворчае паліграфічнае аб'яднанне імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.